772
N 102

Д40

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ

УДК 374.71: 379.821 (476) (043)

Макарава Алена Аляксандраўна

# ФУНКЦЫЯНАЛЬНА-СТРУКТУРНЫЯ ПЕРАЎТВАРЭННІ Ў ДЗЕЙНАСЦІ КЛУБНЫХ УСТАНОЎ У БЕЛАРУСІ

13.00.05 – тэорыя, методыка і арганізацыя
сацыяльна-культурнай дзейнасці

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2002

772
M 132

Работа выканана на кафедры менеджменту сацыякультурнай сферы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры

Навуковы кіраўнік -- кандыдат педагагічных навук, прафесар, рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры **Я.Д. Грыгаровіч**

Афіцыйныя апаненты: -- доктар педагагічных навук, прафесар, дырэктар Інстытута дадатковай адукацыі пры Маскоўскім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў **В.С. Садоўская**

-- кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры народна-інструментальнай творчасці Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры **В.М. Глубачэнка**

Апаніруючая арганізацыя -- Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка

Абарона адбудзецца "___" ______ 2002 г. у "____" гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.03 у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры, тэл. вучонага сакратара 222-83-59.
Адрас: 220001, г.Мінск, вул. Рабкораўская, 17, ауд. 231

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры

Аўтарэферат разасланы "____"________ 2002 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый
кандыдат педагагічных навук,
дацэнт Казлоўская Л.І.



## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** Карэнныя змены ў палітычным і эканамічным жыцці нашай краіны апошніх дзесяцігоддзяў XX стагоддзя прывялі да прынцыпова новага разумення сутнасці сацыяльна-культурнай дзейнасці, якая адбываецца ва ўмовах вольнага часу, аказалі важны ўплыў на месца і ролю клубных устаноў у культурным жыцці грамадства. Час вызначыў новыя патрабаванні да дзейнасці клубных устаноў як аднаго з найбольш распаўсюджаных у Беларусі сацыяльна-культурных інстытутаў. Станаўленне дэмакратычнай і суверэннай дзяржавы ў пераходны перыяд развіцця нашай краіны выклікала неабходнасць неадкладнага вырашэння прававых, эканамічных, інфармацыйна-метадычных і кадравых праблем дзейнасці сучаснай клубнай установы.

Пытанні развіцця ў нашай краіне клубных устаноў стаяць даволі востра і, зразумела, патрабуюць свайго вырашэння. Сучасная сістэма дзяржаўных устаноў клубнага тыпу ў асноўным склалася да сярэдзіны 70-х гадоў мінулага стагоддзя. Грамадская роля клубных устаноў як сацыяльных інстытутаў выхавання насельніцтва была трывала замацавана ў адпаведных дзяржаўных актах. Да пачатку 90-х гадоў XX стагоддзя ўся сістэма культурна-асветніцкай работы будавалася на суб'ектна-аб'ектнай мадэлі, у якой чалавек разглядаўся ў якасці аб'екта ўздзеяння, а не як суб'ект сацыяльна-культурнай дзейнасці. Культурная палітыка, якая ажыццяўлялася клубнымі ўстановамі ў мінулыя дзесяцігоддзі, даволі поўна адлюстроўвалася ў прынятым тлумачэнні паняцця "культурна-асветніцкая работа", калі першапачатковы змест паняцця "асветніцтва" ў самым высакародным яго сэнсе падмяняўся мэтанакіраваным абслугоўваннем клубнымі ўстановамі існуючай ідэалогіі.

Актуальнасць даследавання, такім чынам, вызначаецца неабходнасцю асэнсавання сацыяльна-культурных працэсаў і змен, што адбываюцца ў сферы вольнага часу; нераспрацаванасцю пытанняў функцыяніравання клубнай установы як сацыяльнага інстытута, прызначанага садзейнічаць развіццю нацыянальнай культуры ва ўсіх формах яе праяўлення і бытавання як на тэарэтыка-метадалагічным, так і на практычным узроўні; адсутнасцю спецыяльных даследаванняў гісторыі станаўлення і развіцця клубных устаноў у Беларусі, у тым ліку ў другой палове XX стагоддзя; наяўнасцю складаных праблем у працэсе рэарганізацыі ўстаноў культуры клубнага тыпу ў розных рэгіёнах краіны; значным недахопам тэарэтычнага і метадычнага абгрунтавання функцыянальна-структурных пераўтварэнняў у сучаснай практыцы дзейнасці клубных устаноў.

Тэма дысертацыйнага даследавання адпавядае асноўным задачам дзяржаўнай праграмы "Функцыяніраванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 года".

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі.** Даследаванне функцыянальна-структурных пераўтварэнняў у дзейнасці клубных устаноў ажыццяўлялася ў межах спецыяльнага сацыялагічнага даследавання Беларускага інстытута праблем культуры "Роля сучасных клубных устаноў у задавальненні культурных патрэбнасцей насельніцтва" (1995--1996 гг.) і рэспубліканскіх праграм Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь: "Шляхі стабілізацыі сеткі дзяржаўных клубных устаноў у новых эканамічных умовах" (1994 --1995 гг.), "Новыя мадэлі

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага універсітэта культуры
РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ

устаноў культуры ў Беларусі" (1999 г.), "Новыя падыходы да праблем сельскай культуры" (2000 г.).

**Мэты і задачы даследавання** абумоўлены актуальнасцю пытанняў функцыяніравання клубных устаноў у нашай краіне, вызначаных на аснове аналізу сучасных канцэптуальна-тэарэтычных распрацовак па праблемах развіцця сацыяльна-культурных працэсаў у грамадстве, вынікамі шэрага сацыялагічных даследаванняў дзейнасці сацыяльна-культурных інстытутаў, а таксама абагульненнем стану клубнай практыкі ў розных рэгіёнах краіны.

Аўтар ставіць сваёй мэтай выявіць абумоўленасць, сутнасць, заканамернасці і тэндэнцыі функцыянальна-структурных пераўтварэнняў у дзейнасці клубных устаноў Беларусі. У адпаведнасці з мэтай даследавання вызначаны наступныя задачы:

- прасачыць этапы станаўлення і развіцця клубных устаноў як аднаго з найбольш распаўсюджаных у Беларусі сацыяльна-культурных інстытутаў і раскрыць прычыны іх крызіснага стану з сярэдзіны 80-х да пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя як перадумовы функцыянальна-структурнага рэфармавання;
- выявіць уплыў сацыякультурных фактараў на функцыяніраванне клубнай установы як сучаснага грамадскага інстытута;
- вызначыць асноўныя тэндэнцыі фарміравання культурных патрэбнасцей насельніцтва ў сферы вольнага часу ў розных рэгіёнах краіны і ролю ўстаноў культуры ў іх задавальненні;
- устанавіць сувязь этнарэгіянальных традыцый са структурай сучасных сацыякультурных патрэбнасцей насельніцтва розных рэгіёнаў краіны;
- вызначыць шляхі функцыянальна-структурных пераўтварэнняў у дзейнасці сучасных клубных устаноў і акрэсліць новыя падыходы да дзяржаўнага рэгулявання іх дзейнасці ў рэгіёнах краіны;
- распрацаваць тэарэтычную мадэль дзейнасці сучаснай клубнай установы як дзейснага сацыяльна-культурнага інстытута.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Аб'ектам дысертацыйнага даследавання выступае дзейнасць дзяржаўных клубных устаноў. Прадметам даследавання з'яўляецца працэс функцыянальна-структурных пераўтварэнняў у дзейнасці клубных устаноў у рэгіёнах краіны другой паловы 90-х гадоў XX стагоддзя.

**Гіпотэза.** Сутнасць гіпотэзы складаецца з наступнага: працэс пераўтварэння клубных устаноў у адпаведнасці з патрабаваннямі часу будзе ажыццяўляцца эфектыўна пры ўмовах, калі ўстановы ў сваёй дзейнасці ўлічваюць агульнакультурныя тэндэнцыі развіцця сферы вольнага часу; засвойваюць і развіваюць рэгіянальныя этнакультурныя традыцыі; улічваюць асаблівасці сучасных сацыякультурных патрэбнасцей насельніцтва кожнага этнарэгіёну; вызначаюць змест і структуру сваёй дзейнасці адпаведна характару сацыякультурных патрэбнасцей і інтарэсаў насельніцтва; кіруюцца мэтамі і задачамі дакладна вызначанай рэгіянальнай культурнай палітыкі.

**Металалогія і метады праведзенага даследавання.** Тэарэтыка-метадалагічная база дысертацыйнай работы фарміравалася з шэрага культуралагічных, сацыялагічных, гістарычных, сацыяльна-педагагічных падыходаў да вывучэння працэсаў функцыяніравання ў грамадстве клубнай установы як аднаго з сацыяльна-культурных інстытутаў.



Метадалагічную аснову даследавання склалі тэарэтычныя распрацоўкі вядомых айчынных і замежных культуролагаў А.І.Арнольдова, Э.А.Арловай, А.Б.Есіна, М.І.Крукоўскага, Р.Я.Мінянкова, В.А.Салеева, А.І.Смоліка, І.Я.Шыршова і іншых па праблемах функцыяніравання і развіцця культуры ў грамадстве. Важнае значэнне для вырашэння задач даследавання мелі тэорыі класічнай сацыялогіі, у першую чаргу М.Вэбера, Э. Дзюркгейма, Р.Мэртана, Т.Парсанса, прысвечаныя пытанням утварэння і функцыяніравання ў грамадстве сацыяльных інстытутаў, вывучэнню сутнасці сацыяльнага дзеяння, сацыяльнага развіцця і сацыяльнага кіравання. Даследаванні І.В.Бястужава-Лады, Р.В.Грабеннікава, А.І.Ляўко, А.Б.Міскевіча, Л.І.Міхайлавай, В.Д.Патрушава, у якіх разглядаюцца сацыялагічныя аспекты праблемы вольнага часу і яго культурнай каштоўнасці, садзейнічалі выпрацоўцы тэарэтычна-канцэптуальнай асновы, праграмы і інстументарыя сацыялагічнага даследавання. Навуковыя распрацоўкі расійскіх і беларускіх даследчыкаў М.А.Арыярскага, Р.М.Біржанцюка і А.П.Маркава, Т.П.Біруковай, М.М.Каралёва, А.С.Запясоцкага, А.С.Каргіна, В.А.Каспяровіча, Т.Р.Кісялёвай і Ю.Д.Красільнікава, У.У.Кірсанава, А.А.Корбут, Л.М.Лыча і У.І.Навіцкага, А.Я.Міхневіча, В.С.Садоўскай, Н.У.Самерсавай, Я.І.Смірновай, Ю.А.Стральцова, У.Я.Суртаева, У.Я.Трыодзіна садзейнічалі ўдакладненню сацыяльнага прызначэння клубных устаноў у сучасным грамадстве, дапамаглі абраць больш мэтазгодныя тэарэтычныя падыходы да вывучэння сацыякультурнай дзейнасці ва ўмовах вольнага часу. Даследаванні М.А.Агурцова, Л.Л.Арчажнікавай, К.У.Гаўрылавец, Я.Д.Грыгаровіч, І.І.Казімірскай, М.М.Конышавай, Г.П.Пятровай, Л.Я.Раманенкі, В.У.Чэчата, М.Н.Шчыраковай і іншых, прысвечаныя пытанням эстэтычнага выхавання, у якіх апасродкавана разглядаюцца пытанні сацыяльна-культурнай дзейнасці, спрыялі выпрацоўцы сацыяльна-выхаваўчых арыенціраў, закладзеных у аснову праграмы дысертацыйнага даследавання.

У даследаванні выкарыстоўваліся наступныя метады: аналіз і сінтэз вопыту клубных устаноў; аналіз статыстычных паказчыкаў развіцця клубных устаноў; уключанае і няўключанае назіранне; метад экспертнай ацэнкі; аналіз дакументаў і архіўных матэрыялаў абласных навукова-метадычных цэнтраў народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы, БелДІПК; метад сацыялагічнага даследавання; фактарны аналіз сацыякультурных патрэбнасцей насельніцтва.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.**

1. Вызначаны асноўныя этапы станаўлення і развіцця клубных устаноў у Беларусі, раскрыты прычыны крызіснага стану дзейнасці клубных устаноў краіны ў 80-я -- пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя.
2. Распрацаваны навукова-тэарэтычная асновы функцыянальна-структурных пераўтварэнняў у дзейнасці клубных устаноў краіны з улікам сучасных тэндэнцый развіцця сферы вольнага часу і сацыякультурных арыенціраў, якія характарызуюць дынаміку культурнага жыцця грамадства.
3. Устаноўлены сувязі этнарэгіянальных традыцый са структурай сучасных культурных патрэбнасцей асобы, сацыяльных груп насельніцтва ў сферы вольнага часу і роля дзяржаўных клубных устаноў у задавальненні культурных патрэбнасцей насельніцтва розных рэгіёнаў краіны.
4. Выяўлены шляхі функцыянальна-структурных пераўтварэнняў у дзейнасці дзяржаўных клубных устаноў як рэгіянальных цэнтраў развіцця нацыянальнай культуры праз іх прафілізацыю, спецыялізацыю, стварэнне новых мадэлей устаноў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры ў сферы вольнага часу і ўкараненне рэгіянальна–мэтавых сацыякультурных праграм для розных груп насельніцтва.

5. Распрацавана і практычна апрабіравана тэарэтычная мадэль клубнай установы як дэмакратычнага і агульнадаступнага, гуманістычна зарыентаванага сацыяльна-культурнага інстытута, які здзяйсняе сацыяльна-культурныя працэсы ў рэгіёнах краіны, надае ім арганізаваны характар і сацыяльна-выхаваўчую накіраванасць. Гуманізацыя і рэгіяналізацыя, самакіраванне і ініцыятыва насельніцтва, улік культурна-гістарычных традыцый, дыферэнцыяцыя і інтэграцыя, праблемна-мэтавы характар дзейнасці вызначаны як асноўныя прынцыпы тэарэтычнай мадэлі клубнай установы.

**Практычная (сацыяльна-эканамічная) вартасць атрыманых вынікаў.**

Атрыманыя вынікі дазваляюць пераасэнсаваць сацыяльную ролю клубных устаноў як рэгіянальных цэнтраў развіцця нацыянальнай культуры; вызначыць змест і структуру сучасных культурных патрэбнасцей насельніцтва і ролю клубных устаноў па іх задавальненні. Вынікі даследавання паглыбляюць навуковыя ўяўленні аб сутнасці сацыяльна-культурнай дзейнасці, якая ажыццяўляецца клубнымі ўстановамі ў сучасны перыяд, абгрунтоўваюць мэтазгоднасць функцыянальна-структурных пераўтварэнняў у практыцы дзейнасці клубных устаноў у рэгіёнах краіны. Выяўляюць дэтэрмінаванасць сучаснай сацыяльна-культурнай дзейнасці клубных устаноў этнакультурнымі традыцыямі рэгіёнаў Беларускага Палесся, Паазер'я, Панямоння і Цэнтральнай Беларусі. Вывады дазваляюць удакладніць задачы рэгіянальнай культурнай палітыкі адносна клубных устаноў на шляху іх функцыянальна-структурнага рэфармавання.

Некаторыя вывады даследавання выкарыстоўваліся аўтарам пры распрацоўцы Палажэння аб самадзейным калектыве мастацкай творчасці Рэспублікі Беларусь, якое зацверджана міністрам культуры Рэспублікі Беларусь і зарэгістравана ў Нацыянальным рэестры прававых актаў Рэспублікі Беларусь 20 мая 1999 г., рэг. № 8/376.

Вынікі даследавання знайшлі ўвасабленне ў шэрагу рэспубліканскіх акцый Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, такіх як рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя "Культурная сфера вольнага часу: стан, праблемы, пошукі" (Мінск, снеж.1995 г.); рэспубліканскі агляд-конкурс аматарскіх аб'яднанняў(1998 г.); рэспубліканскі агляд-конкурс раённых Дамоў культуры і раённых арганізацыйна-метадычных цэнтраў на лепшую арганізацыю культурнага абслугоўвання сельскага насельніцтва (2000 г.); рэспубліканскі агляд-конкурс абласных навукова-метадычных цэнтраў народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы (2001 г.). На аснове вынікаў дысертацыйнага даследавання распрацаваны раздзел "Культурна-адпачынкавая дзейнасць" Адукацыйнага стандарта Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці Г.01.01.00 "культуралогія". Вынікі даследавання ўлічаны пры распрацоўцы вучэбных праграм курса "Сацыяльна-культурная дзейнасць" для студэнтаў БДУ культуры і слухачоў факультэта павышэння кваліфікацыі Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.**

1. На этапе пераадольвання крызіснага перыяду сярэдзіны 80-х -- пачатку 90-х гг. XX стагоддзя клубныя ўстановы Беларусі пераўтвараюцца ў дэмакратычны, агульнадаступны, гуманістычна зарыентаваны інстытут, які здзяйсняе сацыяльна-культурныя працэсы ў рэгіёнах краіны, надае ім арганізаваны характар і сацыяльна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выхаваўчую накіраванасць. Гуманізацыя і рэгіяналізацыя, самакіраванне і ініцыятыва насельніцтва, улік культурна-гістарычных традыцый, дыферэнцыяцыя і інтэграцыя, праблемна-мэтавы характар дзейнасці выступаюць галоўнымі прынцыпамі функцыянальна-структурных пераўтварэнняў у дзейнасці клубных устаноў і асновай ажыццяўлення адносна іх дзяржаўнай культурнай палітыкі. Дзяржаўная клубная ўстанова як дэпалітызаваны грамадскі інстытут паступова набывае адпаведнасць свайму сацыяльнаму прызначэнню.

2. Клубныя ўстановы Беларусі як сапраўдны сацыяльна-культурны інстытут ў сучасны перыяд развіцця грамадства забяспечваюць падтрымку культуры ў рэгіёнах, развіццё народнай творчасці як яе неад'емнай часткі, ахоўваюць нацыянальную самабытнасць культуры, здзяйсняюць сацыякультурную дзейнасць насельніцтва ва ўмовах вольнага часу і гэтым ствараюць неабходныя перадумовы для гарманічнага развіцця асобы, розных сацыяльных груп насельніцтва і грамадства ў цэлым. Працэс рэфармавання клубных устаноў у адпаведнасці з сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі і галоўнымі прыярытэтамі развіцця нацыянальнай культуры адбываецца больш актыўна і плённа там, дзе назіраецца паслядоўная, сістэмная і мэтанакіраваная дзейнасць органаў культуры і навукова-метадычных структур па ажыццяўленні дзяржаўнай культурнай палітыкі ў сферы сацыякультурнай дзейнасці, у тым ліку народнай творчасці.

3. Працэс функцыянальна-структурных пераўтварэнняў дзяржаўных клубных устаноў ажыццяўляецца згодна з сучаснымі сацыякультурнымі патрэбнасцямі насельніцтва рэгіёнаў (рэкрэацыйна-забаўляльнымі, пазнавальна-адукацыйнымі, інфармацыйна-камунікатыўнымі, мастацка-творчымі, святочна-відовішчнымі). Задавальненне гэтых патрэбнасцей з'яўляецца асновай фарміравання сацыяльных тэхналогій дзейнасці клубнай установы, якія будуюцца на спалучэнні гістарычных, этнакультурных традыцый, сацыяльна-псіхалагічных, выхаваўчых падыходаў і сучасных інавацыйных мадэлей грамадскіх паводзін.

4. Стабілізацыя дзейнасці клубных устаноў у рэгіёнах абумоўлена зваротам да этнарэгіянальных традыцый і звычаяў беларускага і іншых народаў нашай краіны. Менавіта культурна-гістарычныя традыцыі асноўных этнарэгіёнаў (Паазер'я, Панямоння, Палесся, Падняпроў'я, Цэнтральнай Беларусі) прадвызначаюць змест і характар сацыякультурнай дзейнасці ва ўмовах вольнага часу. Кожная клубная ўстанова унікальная толькі ў сваім сацыяльна-культурным асяроддзі, таму не можа існаваць адзінай, універсальнай мадэлі клубнай установы як у сельскіх, так і гарадскіх умовах. Функцыі і структура дзейнасці клубнай установы вызначаюцца рэгіянальнымі і мясцовымі ўмовамі, а таксама наяўнасцю матэрыяльных, кадравых і інфармацыйных рэсурсаў.

5. Функцыянальна-структурнае рэфармаванне дзяржаўных устаноў клубнага тыпу на шляху прафілізацыі, спецыялізацыі, стварэння новых тыпаў устаноў культуры і ўкаранення мэтавых рэгіянальных праграм спрыяе актуалізацыі іх дзейнасці ў грамадстве.

6. Клубная ўстанова як дзейсны сацыяльна-культурны інстытут выступае ў якасці сацыяльна арганізаванай прасторы духоўнага і фізічнага станаўлення асобы чалавека, яго самарэалізацыі і самавызначэння; цэнтра развіцця рэкрэацыйнай культуры розных сацыяльных груп і слаёў грамадства; творчай лабараторыі самадзейнага мастацтва ва ўсіх відах і формах яго бытавання; акумулятара культурнай актыўнасці і ініцыятывы розных груп насельніцтва ў сферы вольнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часу, арганізатара святочна-відовішчных праграм на аснове як традыцыйных, так і інавацыйных тэхналогій; каардынатара культурнага жыцця і розных сацыякультурных працэсаў у рэгіёнах краіны.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Даследаванне выканана самастойна і складаецца з навукова-тэарэтычнага асэнсавання сацыяльнай ролі клубных установ у развіцці беларускай нацыянальнай культуры; вызначэння асноўных этапаў станаўлення і развіцця клубных установ у Беларусі XX стагоддзя; раскрыцця прычын крызісных з'яў у практыцы функцыяніравання клубных установ у 80--90-я гг.; устанаўлення абумоўленасці сучаснай сацыяльна-культурнай дзейнасці характарам і зместам этнарэгіянальных традыцый; выяўлення шляхоў функцыянальна-структурных пераўтварэнняў клубных установ; развіцця тэарэтычных падыходаў да рэгулявання дзейнасці клубных установ як на рэгіянальным, так і на дзяржаўным узроўні. За дзейсную навукова-метадычную дапамогу ўстановам культуры рэспублікі, што ажыццяўлялася на аснове вынікаў дысертацыйнага даследавання, аўтар работы ў 2000 г. быў адзначаны Ганаровай граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. За асабісты ўклад у працэс удасканальвання сістэмы метадычнага забеспячэння дзейнасці абласных навукова-метадычных цэнтраў народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы ў 2001 г. аўтар узнагароджаны дыпломам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Вынікі і асноўныя палажэнні даследавання былі прадстаўлены ў форме дакладаў на рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцыях: "Культурная сфера вольнага часу: стан, праблемы, пошукі" (Мінск,1995 г.); "Аматарская творчасць у Беларусі: устойлівыя і новыя тэндэнцыі" (Мінск,1998 г.). Выступленні па тэме даследавання адбыліся на рэспубліканскіх семінарах кіраўнікоў органаў культуры па праблемах удасканалення дзейнасці і фарміравання новых мадэлей і тыпаў установ культуры (чэрвень 1999 г., снежань 2000 г.), на абласных канферэнцыях і семінарах работнікаў культуры Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай, Гомельскай, Магілёўскай, Мінскай абласцей (1995--2000гг.), навуковых і навукова-метадычных канферэнцыях Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры.

**Апублікаванасць вынікаў.** Па праблеме і выніках даследавання апублікаваны 23 работы, з іх 6 -- у сааўтарстве. Агульная колькасць старонак друкаваных матэрыялаў -- 160, акрамя калектыўнай манаграфіі.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў і заключэння. Спіс выкарыстаных крыніц складае 296 найменняў. Агульны аб'ём дысертацыйнага даследавання -- 182 с., уключаючы 12 дыяграм, 5 табліц і 6 дадаткаў.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

У першай главе **"Сацыякультурная дынаміка развіцця клубных установ у Беларусі"** даследуецца развіцце клубнай ўстановы як аднаго з найбольш распаўсюджаных сацыяльна-культурных інстытутаў у нашай краіне. Клубныя ўстановы разглядаюцца ў складанай дынаміцы свайго станаўлення з моманту ўтварэння і да сучаснага перыяду. У першым параграфе *"Клубная ўстанова як сацыяльна-культурны інстытут сферы вольнага часу"* разглядаюцца пытанні



інстытуцыялізацыі ў грамадстве, выяўляюцца механізмы ўтварэння сацыяльна-культурных інстытутаў. Вызначаюцца сацыякультурны феномен вольнага часу і сутнасць сацыякультурнай дзейнасці ва ўмовах вольнага часу. Культурная сфера вольнага часу мае ў Беларусі даволі развітую інфраструктуру і прадстаўлена рознымі відамі і формамі дзейнасці, рознымі ўзроўнямі і ступенямі каштоўнасцей для развіцця асобы, сацыяльных груп і грамадства ў цэлым. Функцыяніраванне дзяржаўных клубных установ як найбольш распаўсюджанага сацыяльнага інстытута сферы вольнага часу (рэгіянальная сетка налічвае 4270 установ клубнага тыпу на 1.01.2001 г.) не ўяўляецца магчымым без удакладнення дынамікі сацыякультурных патрэбнасцей асобы, сацыяльных груп насельніцтва і грамадства.

Клубныя ўстановы як сацыяльна-культурны інстытут прызначаны забяспечваць устойлівыя формы арганізацыі сумеснай дзейнасці людзей, надаваць стабільнасць, надзейнасць, мэтазгоднасць і рэгулярнасць задавальненню патрэбнасцей асобных суб'ектаў, сацыяльных груп, грамадства і дзяржавы ў змястоўным выкарыстанні вольнага часу. Аналіз практыкі функцыяніравання клубных установ у 42 раёнах розных абласцей і этнарэгіёнаў Беларусі сведчыць, што пазначаныя задачы далёка не ў поўнай меры рэалізуюцца ў паўсядзённай дзейнасці гэтых структур, чым і выклікана неабходнасць спецыяльных даследаванняў дзейнасці сучасных клубных установ.

У другім параграфе главы *"Этапы станаўлення і развіцця клубных установ у Беларусі XX стагоддзя"* клубныя ўстановы разглядаюцца ў розныя перыяды іх грамадска-гістарычнага развіцця; робіцца спроба раскрыцця прычын наяўнага крызісу, які распачаўся ў дзейнасці клубных структур з сярэдзіны 80-х гадоў мінулага стагоддзя. Дзейнасць установ культуры клубнага тыпу з самага пачатку свайго існавання ў межах былога савецкага грамадства была цесна звязана з задачамі ідэйна-палітычнага выхавання працоўных. Асноўныя тэарэтычныя падыходы да функцыяніравання клубнай установы былі вызначаны ў 1920--1922 гг., прычым яе мадэль была даволі дэмакратычнай і ставіла мэты культурнага асветніцтва, хаця і без уліку традыцый нацыянальнага, этнарэгіянальнага, свецкага і рэлігійнага характару. Галоўныя прынцыпы, змест і структура дзейнасці сучасных клубных структур пачалі закладвацца яшчэ ў 30-я гг. Ідэалагічныя вымярэнні клубнай установы як цэнтра камуністычнага выхавання былі замацаваны ў адпаведных дзяржаўных актах таго часу. У гэты перыяд адзначаюцца паступовы рост колькасці ўстаноў культуры клубнага тыпу і пашырэнне сферы ўздзеяння клубаў на розныя бакі жыццядзейнасці грамадства.

Пэўныя дэмакратычныя працэсы кранулі дзейнасць клубных установ у 60-я гады мінулага стагоддзя, у час "грамадскай адлігі", калі ідэя клубнай установы наблізілася да тэарэтычнай мадэлі "клуба ў клубе", звязанай са стварэннем самадзейных аб'яднанняў і праяўленнем іншых формаў сацыяльнай актыўнасці насельніцтва. Адзначаецца спроба дэмакратызацыі кіравання дзейнасцю клубных установ як на агульнасаюзным, так і мясцовым узроўні. У 70-я гады канчаткова склалася сістэма дзяржаўных установ клубнага тыпу, мэты і задачы іх дзейнасці атрымалі ў гэты перыяд надзейнае тэарэтычнае і метадычнае забеспячэнне. Усталявалася трывалая інфраструктура сацыякультурнай сферы, што абслугоўвала дзейнасць клубных установ па напрамках камуністычнага выхавання.

У час грамадскай "перабудовы" сярэдзіны 80-х гг. XX стагоддзя ўпершыню была зроблена спроба ацаніць грамадскую ролю клубных установ, вызначыць іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Другая глава дысертацыі **"Прыярытэты і асноўныя напрамкі дзейнасці клубных устаноў як цэнтраў развіцця беларускай нацыянальнай культуры"** складаецца з двух параграфаў. Першы параграф *"Клубная ўстанова як суб'ект рэалізацыі прыярытэтаў дзяржаўнай культурнай палітыкі"* адлюстроўвае ролю клубных устаноў у рэалізацыі культурнай палітыкі, вызначанай дзяржавай ва ўмовах суверэнітэту і незалежнасці. Клубныя ўстановы забяспечваюць падтрымку і станоўчую дынаміку культурна-творчых працэсаў па аднаўленні і ўзбагачэнні зместу і формаў сацыякультурнай дзейнасці насельніцтва ў сферы вольнага часу. Гэтыя працэсы рэалізуюцца ў дзейнасці клубных устаноў праз зварот да традыцыйных асноў беларускай нацыянальнай культуры і суадносна з сучаснымі патрэбнасцямі насельніцтва розных рэгіёнаў краіны.

Даследаванне пацвердзіла, што клубныя ўстановы, дзякуючы ўстойлівасці, стабільнасці, замацаванню ў сваёй дзейнасці нормаў і эталонаў паводзін, эстэтычных каштоўнасцей, спрыяюць нармалізацыі жыцця грамадства. Забяспечваюць падтрымку культуры ў рэгіёнах, ажыццяўляючы развіццё народнай творчасці як неад'емнай часткі культуры. Ахоўваючы нацыянальную самабытнасць культуры, яны ствараюць неабходныя перадумовы для гарманічнага развіцця асобы, сацыяльных груп і грамадства. Дзейнасць дзяржаўных клубных устаноў у рэгіёнах краіны, якая праяўляецца ў розных формах народнай творчасці, традыцыях і звычаях, адлюстроўвае асаблівасці менталітэту народаў краіны, спрыяе распрацоўцы разгорнутай канцэпцыі развіцця беларускай культуры.

Другі параграф *"Дзейнасць дзяржаўных клубных устаноў па задавальненні культурных патрэбнасцей насельніцтва краіны"* прысвечаны аналізу вынікаў сацыялагічнага даследавання, праведзенага ў 1995--1996 гг. у наступных раёнах розных абласцей (акрамя Магілёўскай): Кармянскім, Рэчыцкім, Хойніцкім, Полацкім, Лёзненскім, Шаркаўшчынскім, Докшыцкім, Глыбоцкім, Расонскім, Міёрскім, Астравецкім, Жлобінскім, Валожынскім, Мінскім, Гомельскім, Навагрудскім, Сенненскім, Іванаўскім.

Для вывучэння культурных патрэбнасцей насельніцтва і дзейнасці ўстаноў культуры па іх задавальненні пад навуковым кіраўніцтвам доктара сацыялагічных навук А.І.Ляўко былі распрацаваны праграма і інструментрый даследавання. Яны ўключалі тры анкеты: клубнага работніка, наведвальніка клуба і "Культурныя патрэбнасці насельніцтва і іх задавальненне ў сферы вольнага часу". Агульная колькасць рэспандэнтаў склала 1320 чалавек, з іх 306 работнікаў клубных устаноў розных рэгіёнаў.

Вынікі даследавання сведчаць, што клубныя ўстановы запатрабаваны сёння ў розных рэгіёнах краіны. Альтэрнатывы ім, асабліва ў сельскіх рэгіёнах, пакуль не існуе. Між тым з агульнай колькасці апытаных жыхароў толькі 65% прызнаюць неабходнасць клубнай установы ў культурным жыцці рэгіёну. Зусім не цікавяцца культурнымі праграмамі, прапануемымі клубамі, больш за 25% удзельнікаў анкетавання. У сучасных умовах тэлевізійныя праграмы (забаўляльныя, канцэртныя, сацыяльна-публіцыстычныя і інш.) становяцца своеасаблівым эталонам поглядаў, густаў, інтарэсу і тым самым фарміруюць мадэлі сацыяльных паводзін. Больш за 60% рэспандэнтаў адзначаюць, што вольны час часцей за ўсё яны праводзяць дома, запаўняюць яго пераважна праглядам тэлеперадач 89% апытаных жыхароў. Натуральна, што патрабаванні да сучаснай клубнай установы значна ўзрастаюць, аб чым сведчыць аналіз адказаў рэспандэнтаў самага рознага ўзросту.



Даследаванне паказала, што колькасць вольнага часу вызначаецца галоўным чынам у залежнасці ад тыпу населенага пункта: жыхары вялікага горада і адначасова сельскай мясцовасці маюць значна меней вольнага часу, чым насельніцтва невялікіх гарадоў і пасёлкаў гарадскога тыпу. Гэты фактар павінен абавязкова ўлічвацца пры распрацоўцы асноў культурнай палітыкі і адлюстроўвацца ў арганізацыі дзейнасці ўстаноў культуры.

Аналіз апытання клубных работнікаў розных раёнаў краіны дае падставу для наступных меркаванняў: у работнікаў культуры склаўся пэўны стэрэатып падыходаў да арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці насельніцтва; у большасці раёнаў рэспублікі адсутнічае сістэма аналізу вопыту работы ўстаноў культуры; адчуваецца недахоп спецыялістаў галіны, здольных да самарэфлексіі і ў стане ажыццяўляць інфармацыйна-аналітычную дзейнасць па трансляцыі станоўчага вопыту арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці і вольнага часу насельніцтва; рэфармаванне дзейнасці клубных устаноў часта ідзе вельмі павярхоўна і мае фармальны характар.

Нельга не адзначыць, што паступова пачынае фарміравацца рэгіянальная палітыка з улікам сацыянальна-культурных патрэбнасцей асобы, сацыяльных груп, грамадства. Вызначыліся асноўныя прыярытэты ў дзейнасці абласных і раённых структур і іх метадычных службаў. Так, асноўнымі арыенцірамі сваёй дзейнасці клубныя работнікі лічаць традыцыі свайго рэгіёну (68%); культурныя патрэбнасці і інтарэсы розных груп насельніцтва (63%); задачы культурнай палітыкі дзяржавы ў сферы народнай творчасці і вольнага часу (34%).

У сярэднім па рэспубліцы толькі 68% работнікаў культуры здавальняюча ацэньваюць дзейнасць сваёй клубнай установы. Вынікі даследавання сведчаць, што сённяшні клуб страціў значную частку сваёй аўдыторыі (па даных апытання жыхароў рэгіёнаў кожны трэці з іх практычна не выяўляе сваёй зацікаўленасці ў дзейнасці клубнай установы). Гэты факт тлумачыцца часткова адсутнасцю арыентацыі ў дзейнасці клубнай установы на рэальныя сацыяльныя праблемы розных груп насельніцтва. Даследаванне дае падставу для меркавання, што сучасную клубную ўстанову належыць разглядаць у якасці аднаго з актыўных сродкаў садзейнічання ў вырашэнні сацыяльна-псіхалагічных, сацыяльна-культурных, прафесійных і іншых праблем насельніцтва рэгіёну. Значная колькасць жыхароў (38%) не могуць задаволіць свае патрэбнасці ў змястоўных зносінах, адчуваюць сябе вельмі адзінокімі амаль 22% жыхароў сельскіх рэгіёнаў краіны. Можна меркаваць, што сваю аўдыторыю клубная ўстанова можа пашырыць, звяртаючыся да жыццёва важных пытанняў, "сацыяльных хвароб" насельніцтва праз уласныя сацыяльна-культурныя праграмы і мерапрыемствы.

Такім чынам, праблемны характар дзейнасці клубных устаноў і наяўнасць спецыяльных сацыяльна-рэабілітацыйных, рэкрэацыйных, сацыяльна-псіхалагічных і іншых праграм, дыферэнцыраваных у адпаведнасці з сацыяльна-дэмаграфічнымі, прафесійнымі, адукацыйнымі характарыстыкамі аўдыторыі, з'яўляюцца асноўнымі арыенцірамі для работнікаў клубных устаноў у сучасных умовах. Улік сацыяльна-псіхалагічных праблем наведвальнікаў выходзіць на першы план у вырашэнні асноўных задач, звязаных з забеспячэннем сацыяльна-культурнай дзейнасці. Рэгулярны аналіз грамадскай ацэнкі сваёй дзейнасці ў значнай ступені дапамагае аператыўнаму рэагаванню клубнай установы на сацыяльна-творчы заказ з боку грамадства праз пэўныя рэгіянальныя культурныя праграмы і асобныя мерапрыемствы.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКіМ

да ўстановы, якая здольна рэагаваць на штодзённыя клопаты і праблемы свайго асяроддзя, прапануе кожнай сацыяльна-дэмаграфічнай, прафесійнай, узроставай групе неабходны "набор" культурных паслуг, пэўныя праграмы, згодна патрэбнасцям і інтарэсам людзей;

- ад клубнай установы, накіраванай на выкананне "глабальных планаў і праграм", да ўстановы, закліканай, у першую чаргу, ахоўваць, падтрымліваць і распаўсюджваць нацыянальна-культурныя каштоўнасці, традыцыйныя ўзоры народнай творчасці, зберагаць культурную спадчыну і садзейнічаць натуральнаму існаванню нацыянальнага мастацтва і сучасных формаў аматарскай дзейнасці.

Асноўнымі арганізацыйнымі прынцыпамі дзейнасці клубных устаноў у рэгіёне з'яўляюцца: каардынацыя -- узгадненне, устанаўленне мэтазгодных суадносін паміж суб'ектамі арганізацыі культурнай дзейнасці; кансалідацыя -- аб'яднанне намаганняў спецыялістаў, розных устаноў і арганізацый сучаснай вёскі; канцэнтрацыя -- засяроджванне творчых, кадравых, фінансавых і іншых рэсурсаў і сродкаў на выкананні прыярытэтных кірункаў культурнага жыцця вёскі; комплекснасць -- сукупнасць усіх суб'ектаў культурнай дзейнасці, суадноснасць і паслядоўнасць дзеянняў па агульных планах праграмы сацыяльна-культурнага развіцця рэгіёну. Працэс рэфармавання клубных устаноў адбываецца больш плённа ў тых рэгіёнах краіны, дзе назіраецца паслядоўная, сістэмная і мэтанакіраваная дзейнасць раённых органаў культуры і метадычных структур, у якой адлюстроўваецца зацікаўленая пазіцыя органаў кіраўніцтва ў правядзенні дзяржаўнай культурнай палітыкі.

Значная роля ў ажыццяўленні кіравання складаным і шматступеньчатым працэсам пераўтварэнняў у дзейнасці сучасных клубных устаноў належыць абласным навукова-метадычным цэнтрам народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы, а таксама арганізацыйна-метадычным структурам раённага ўзроўню. Рэчаіснасць патрабуе прынцыповага аднаўлення функцый навукова-метадычных структур, прызначаных абагульняць, сістэматызаваць, вывучаць, аналізаваць і прагназаваць развіццё розных сацыяльна-культурных працэсаў у культурным жыцці рэгіёнаў.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

1.Дэмакратызацыя культурнага жыцця нашай краіны, дэцэнтралізацыя кіраўніцкай дзейнасці ў галіне культуры, актывізацыя працэсаў самаарганізацыі культурных ініцыятыў ў рэгіёнах і адначасова апрабацыя новых мадэлей ўстаноў культуры і ўкараненне сацыяльна-культурных праектаў -- усё гэта ствараe новую грамадскую аснову для развіцця сферы вольнага часу і народнай творчасці, спрыяе пераўтварэнням у сістэме ўстаноў культуры, уключаючы сельскія Дамы культуры і клубы. Жыццяздольнасць клубнай установы вызначаецца адпаведнасцю зместу і характару яе дзейнасці грамадскім мэтам і патрэбам, дзеля якіх яна ўтвараецца як сацыяльна-культурны інстытут [13, 14].

2. Далейшае развіццё сістэмы клубных устаноў рэспублікі з'яўляецца адной з актуальных задач культурнай палітыкі дзяржавы. Працэс функцыянальна-структурнага рэфармавання і сацыяльна-культурных пераўтварэнняў у дзейнасці сучасных клубных устаноў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з прыярытэтамі развіцця



беларускай культуры. Нягледзячы на складаныя сацыяльна-эканамічныя ўмовы канца XX--пач.XXI стагоддзя, дзяржаўныя клубныя ўстановы Беларусі выконваюць сваю сацыяльную ролю ў культурным жыцці рэспублікі: ствараюць умовы для сацыяльна-культурнай актыўнасці грамадзян, забяспечваюць працэсы захавання, стварэння і распаўсюджвання культурных каштоўнасцей. Сваёй дзейнасцю яны спрыяюць развіццю і пашырэнню культурнай сферы вольнага часу [10,14,18].

3. У параўнанні з мадэллю 70-х--пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя сучасная клубная ўстанова ў рэгіёне -- адносна самастойная ўстанова, якая паступова набывае сваю непаўторнасць і прывабнасць праз арыгінальныя праграмы, рэгіянальныя прыметы і формы сацыяльна-культурнай дзейнасці. Значная колькасць клубных фарміраванняў розных кірункаў мастацка-творчай, культурна-аматарскай і іншых відаў дзейнасці прадстаўлена амаль у кожнай установе культуры, таму сучасная клубная ўстанова ўсё больш уяўляе ўстанову "клубаў у клубе" [6,13,15].

4. Працэс функцыянальна-структурных пераўтварэнняў у дзейнасці дзяржаўных клубных устаноў у Беларусі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з сучаснымі сацыякультурнымі патрэбнасцямі асобы, розных груп насельніцтва, грамадства ў цэлым. Сацыякультурныя патрабаванні насельніцтва розных рэгіёнаў абумоўлены этнатрадыцыямі і выступаюць у якасці галоўнага арыенціра пры вызначэнні характару і зместу дзейнасці клубнай установы канкрэтнага рэгіёну. Ажыццяўляючы даволі актыўную культурна-займальную работу сярод насельніцтва, мэта якой адпачынак і рэкрэацыя, гульнявыя зносіны, забаўлянне, аматарская творчасць, адукацыйна-пазнавальная і святочна-відовішчная дзейнасць, клубныя ўстановы ўсё больш запаўняюць вольны час праграмамі і мерапрыемствамі, якія задавальняюць канкрэтных людзей, іх культурныя патрэбнасці і інтарэсы [10,12,13 ].

5. У рэгіёнах Беларусі даволі актыўна ідзе пошук новых мадэлей сучасных клубных ўстаноў, тыпаў устаноў культуры і вольнага часу, а таксама новых падыходаў да арганізацыі іх дзейнасці. Кожная клубная ўстанова унікальная ў сваім сацыяльна-культурным асяроддзі, яе функцыі вызначаюцца рэгіянальнымі і мясцовымі ўмовамі, наяўнасцю матэрыяльных, кадравых і інфармацыйных рэсурсаў, таму не можа існаваць адзінай, універсальнай мадэлі клубнай установы як на вёсцы, так і ў гарадскіх умовах [7,13,18].

6. Праблемны характар дзейнасці клубных устаноў і наяўнасць спецыяльных сацыяльна-рэабілітацыйных, рэкрэацыйных, сацыяльна-псіхалагічных і іншых праграм, дыферэнцыраваных у адпаведнасці з узроставымі, адукацыйнымі, прафесійнымі характарыстыкамі аўдыторыі, выступаюць у якасці прафесійнага арыенціра для работнікаў культуры ў сучасных умовах. На першы план у вырашэнні асноўных задач, звязаных з забеспячэннем дзейнасці клубных устаноў, выходзіць улік сацыяльна-псіхалагічных праблем розных катэгорый насельніцтва [11,15,17].

7. Даследаванне пацвярджае неабходнасць больш глыбокага і ўсебаковага асэнсавання ўплыву на сучасны стан сацыяльна-культурнага жыцця рэспублікі як з боку культурна-гістарычных традыцый, так і інавацыйных тэхналогій. Гэта дасць магчымасць прасачыць пераемнасць і паслядоўнасць у станаўленні і развіцці розных формаў і мадэлей сацыяльных паводзін насельніцтва адпаведных рэгіёнаў у сферы вольнага часу, вылучыць асаблівасці арганізацыі адпачынку, забаўляльнай дзейнасці, аматарскай творчасці, святочнай дзейнасці і г.д. [2,15,16].

8. Клубная ўстанова як дзейсны сацыяльна-культурны інстытут выступае ў якасці сацыяльна арганізаванай прасторы духоўнага і фізічнага станаўлення асобы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чалавека, яго самарэалізацці і самавызначэння; цэнтра развіцця рэкрэацыйнай культуры розных сацыяльных груп і слаёў грамадства; творчай лабараторыі самадзейнага мастацтва ва ўсіх відах і формах яго бытавання; акумулятара культурнай актыўнасці і ініцыятывы розных груп насельніцтва ў сферы вольнага часу; арганізатара святочна-відовішчных праграм на аснове як традыцыйных, так і інавацыйных тэхналогій; каардынатара культурнага жыцця і розных сацыякультурных працэсаў у рэгіёнах краіны [13,15].

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ


**Калектыўная манаграфія**

1. Смолік А.І., Мамонька У.А., Маісеенка А.Р., Шведава Г.С., Аўдзей С.В., Гулак А.А., Баравік Р.І., Акуліч У.А., Паўлава С.А., Зязюля А.Р., Драчова Л.А., Макарава А.А. Дзейнасць устаноў культуры па мінімізацыі наступстваў чарнобыльскай трагедыі / Пад рэд. А.І. Смоліка. -- Мінск: Бел. ун-т культуры, 1999.--160 с.

**Артыкулы ў навуковых часопісах.**

2. Макарава Е.А. Поддержать, что еще живо в народе // Клуб. -- 1996. -- № 6. -- С.19--20.

**Артыкулы ў навуковых зборніках і часопісах**

3. Макарова Е.А. О проблемах организации общения в досуговых группах //Вопросы культуры и искусства Белоруссии. -- Мінск: Вышэйш. шк., 1989. -- Вып.8. -- С. 26--32.

4. Макарова Е.А. Проблемы совершенствования методического руководства деятельностью клубных любительских объединений в Белоруссии //Вопросы культуры и искусства Белоруссии. -- Мінск: Вышэйш. шк., 1990. -- Вып. 9. -- С. 8 -- 12.

5. Макарава А.А., Сівурава Л.П. Аб дзейнасці ўстаноў клубнага тыпу //Культурнае жыццё рэспублікі: стан, праблемы, тэндэнцыі: Стат. агляд тэатр.-відовішч. і культ.-асвет. устаноў сістэмы М-ва культуры РБ за 1994 г./ БелІПК. -- Мінск, 1995. -- С.21-- 38.

6. Макарава А.А. Сацыяльна-культурная дзейнасць у сферы вольнага часу: стан, праблемы, пошукі //Інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы /БелІПК. -- Мінск, 1995. --Вып.3 -- 4. -- С.1--8.

7. Макарава А.А. Установы культурнай сферы вольнага часу ў люстэрку статыстычнай інфармацыі //Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: Навук.-інфарм. зб./ Нац. б-ка Беларусі.--Мінск, 1996. -- Вып.3. -- С. 52--58.

8. Макарава А.А. Паркі культуры і адпачынку //Культурнае жыццё рэспублікі: стан, праблемы, тэндэнцыі: Стат. агляд тэатр.- відовішч. і культ.-асвет. устаноў сістэмы М-ва культуры РБ за 1995 г./ БелІПК. -- Мінск, 1996. -- С. 97--111.

9. Макарава А.А. Возера Нарач. "Пеўчае поле". Пачатак традыцыі?// Мастацтва. -- 1996. -- №1. -- С.38.

10. Макарава А.А., Сівурава Л.П. Каментарый да статыстычнай справаздачнасці клубных устаноў //Культурнае жыццё рэспублікі: стан, праблемы, тэндэнцыі: Стат. агляд тэатр.-відовішч. і культ.-асвет. устаноў сістэмы М-ва культуры РБ за 1995г. / БелІПК.-- Мінск, 1996. -- С. 36--59.





11. Макарова Е.А. К итогам социологического исследования "Роль клубных учреждений в удовлетворении культурных потребностей населения регионов Беларуси // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: Навук.-інфарм. зб. / Нац. б-ка Беларусі. --Мінск, 1997. --Вып.1. -- С.44 --51.

12. Макарава А., Сівурава Л. Аб шляхах фарміравання фестывальных традыцый у самадзейнай мастацкай творчасці // Веснік БелІПК. -- 1999. -- С. 107-- 112.

13. Макарава А.А. Сацыяльна-культурныя пераўтварэнні ў дзейнасці сучасных клубных устаноў// Інфармацыйныя матэрыялы да рэспубліканскага семінара «Новыя падыходы да праблем сельскай культуры» (Мінск, 14--15 снеж. 2000г.). -- Мінск: БелІПК, 2001. -- С.29--51.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

14. Макарава А.А. Культурная сфера вольнага часу: пытанні тэорыі і практыкі //Культурная сфера вольнага часу: стан, праблемы, пошукі: Матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф. (Мінск, снеж. 1995г.). -- Мінск: БелІПК, 1997. -- С.8--15.

15. Макарава А.А. Клуб: мадэль XXI стагоддзя: Аб выніках работы творчай лабараторыі // Культурная сфера вольнага часу: стан, праблемы, пошукі: Матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф. ( Мінск, снеж. 1995г.).-- Мінск: БелІПК, 1997. -- С. 78--83.

**Тэзісы дакладаў на канферэнцыях**

16. Макарова Е.А. Роль семейных клубов в духовном общении родителей и детей //Социально-педагогические и правовые аспекты защиты личности ребенка и детских организаций в свете Конвенции ООН о правах ребенка и закона Республики Беларусь «О правах ребенка»: Тез. докл. науч.конф. (Минск, 1994г.). -- Мінск: Респ. ин-т ПК и переподгот. рук. работн. и специалистов обр.-- 1994.-- Т.2. -- С.65--67.

17. Макарова Е.А. Итоги стажировки выпускников кафедры теории и методики культурно-просветительной работы /1984 --1988 гг./ //Вопросы теории и практики культурно-просветительной работы: Тез. докл. науч.- практ. конф. препод. состава ( Минск, 1991г.). -- Минск: Минск. ин-т культуры, 1991. -- С.16--19.

18. Макарава А.А., Сівурава Л.П. Сацыяльная роля дзяржаўных клубных устаноў па арганізацыі вольнага часу і праблемы метадычнага кіраўніцтва іх дзейнасцю ў сучасных умовах //Актуальныя праблемы і навуковыя пошукі ў галіне культуры і мастацтва: Тэз. дакл. навук.-творч. канф. (Мінск, 19--20 крас. 1994 г.). -- Мінск: Бел. ун-т культуры, 1994. -- С.16-17.

19. Макарава А.А. Інфармацыйна-камунікатыўныя аспекты дзейнасці выкладчыка вышэйшай навучальнай установы // Прафесіяналізм выкладчыкаў універсітэта ва ўмовах пераходу да шматузроўневай сістэмы адукацыі: Тэз. дакл. на навук. - метад. канф. (Мінск, 1--2 лют. 1994 г.). -- Мінск: Бел. ун-т культуры, 1994. -- С.64-65.

**Артыкулы ў штотыднёвіках і газетах**

20. Клионская О., Макарова Е. Давайте полюбим... любителя, или Кому нужны клубы по интересам? // Вечерний Минск. -- 1990. -- 21 марта.

21. Макарава А.А. Лёс вясковай культуры // Культура. -- 1995.-- 20--26 снежня.

**Метадычныя рэкамендацыі**

22. Макарова Е.А., Каратова М.В. Рекомендации в помощь организаторам и руководителям клубов молодой семьи. -- Минск.: МДСТ Белсовпрофа, 1988. -- 14 с.

23. Макарава А.А. Развіццё дыскатэчнага руху ў сучасных умовах // Дыскатэка: Дапаможнік па арганізацыі дыскатэчных мерапрыемстваў. -- Мінск.: Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці, 1997. -- С. 3 -- 7.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЕЗЮМЕ

### Макарова Елена Александровна

### Функционально-структурныя преобразования в деятельности клубных учреждений в Беларуси

**Ключевые слова:** клубные учреждения, досуг, социально-культурная деятельность, народное творчество, культурные потребности населения, функционально-структурные преобразования, этнорегиональные традиции, региональная культурная политика, новые типы учреждений культуры.

Диссертация посвящена изучению процесса функционально-структурных преобразований в деятельности клубных учреждений регионов страны.

**Целью исследования является** определение обусловленности, сущности, закономерностей и тенденций функционально-структурных преобразований в деятельности государственных клубных учреждений в Беларуси.

**Использовались следующие методы исследования:** анализ и синтез опыта клубных устаноў; анализ статистических показателей развития клубных учреждений; включенное и невключенное наблюдение; метод экспертной оценки; метод социологического исследования; факторный анализ социокультурных потребностей населения разных регионов страны.

**Научная новизна и теоретическая значимость полученных результатов заключается в** определении основных этапов становления и развития клубных учреждений в Беларуси; раскрытии причин кризисного состояния клубных учреждений в середине 80-х -- начале 90-х годов XX столетия; разработке научно-теоретических основ функционально-структурных преобразований в деятельности клубных учреждений с учетом современных тенденций развития культурно-досуговой сферы; установлении связи этнорегиональных традиций со структурой современных культурных потребностей личности, социальных груп населения в сфере свободного времени; выявлении путей функционально-структурных преобразований в деятельности клубных учреждений как региональных центров развития национальной культуры через их профилизацию, специализацию, создание новых моделей учреждений культуры в сфере досуга и внедрение регионально-целевых социокультурных программ. Разработана и практически апробирована теоретическая модель клубного учреждения как демократического и общедоступного, гуманистически сориентированного социально-культурного института.

**Социально-экономическая значимость исследования** заключается в его направленности на повышение социально-культурной эффективности деятельности государственных клубных учреждений как центров развития белорусской национальной культуры, совершенствование механизмов функционально-структурных преобразований в деятельности клубных учреждений в разных регионах страны в соответствии с современными социокультурными потребностями общества. Результаты исследования рекомендованы для использования работниками культуры, нашли свое воплощение в ряде республиканских мероприятий; вошли в учебные программы для студентов Белорусского государственного университета культуры и слушателей Белорусского государственного института проблем культуры.



## РЭЗЮМЭ

### Макарава Алена Аляксандраўна

### Функцыянальна-структурныя пераўтварэнні ў дзейнасці клубных устаноў у Беларусі

**Ключавыя словы:** клубныя ўстановы, вольны час, сацыяльна-культурная дзейнасць, народная творчасць, культурныя патрэбнасці насельніцтва, функцыянальна-структурныя пераўтварэнні, этнарэгіянальныя традыцыі, рэгіянальная культурная палітыка, новыя тыпы ўстаноў культуры.

Дысертацыя прысвечана вывучэнню працэсу функцыянальна-структурных пераўтварэнняў у дзейнасці клубных устаноў у рэгіёнах краіны.

**Мэтай даследавання** з'яўляецца вызначэнне абумоўленасці, сутнасці, заканамернасцей і тэндэнцый функцыянальна-структурных пераўтварэнняў ў дзейнасці клубных устаноў у Беларусі.

**Выкарыстоўваліся наступныя метады даследавання:** аналіз і сінтэз вопыту клубных устаноў; аналіз статыстычных паказчыкаў развіцця клубных устаноў; уключанае і няўключанае назіранне; метад экспертнай ацэнкі; метад сацыялагічнага даследавання; фактарны аналіз сацыякультурных патрэбнасцей насельніцтва розных рэгіёнаў краіны.

**Навуковая навізна і тэарэтычная значнасць атрыманых вынікаў заключаецца** ў вызначэнні асноўных этапаў станаўлення і развіцця клубных устаноў у Беларусі, раскрыцця прычын іх крызіснага стану ў 80-я - пачатку 90-х гадоў XX стагоддзя; распрацоўцы навукова-тэарэтычных асноў функцыянальна-структурных пераўтварэнняў у дзейнасці клубных устаноў з улікам сучасных тэндэнцый развіцця сферы вольнага часу; устанаўленні сувязей этнарэгіянальных традыцый са структурай сучасных культурных патрэбнасцей асобы, сацыяльных груп насельніцтва ў сферы вольнага часу і ролі дзяржаўных клубных устаноў у задавальненні культурных патрэбнасцей насельніцтва розных рэгіёнаў краіны; вызначэнні шляхоў функцыянальна-структурных пераўтварэнняў ў дзейнасці клубных устаноў як рэгіянальных цэнтраў развіцця нацыянальнай культуры праз іх прафілізацыю, спецыялізацыю, стварэнне новых мадэлей устаноў культуры ў сферы вольнага часу і ўкараненне рэгіянальна--мэтавых сацыякультурных праграм. Распрацавана і практычна апрабіравана тэарэтычная мадэль клубнай ўстановы як дэмакратычнага і агульнадаступнага, гуманістычна зарыентаванага сацыяльна-культурнага інстытута.

**Сацыяльна-эканамічная значнасць даследавання** заключаецца ў яго накіраванасці на павышэнне сацыяльна-культурнай эфектыўнасці дзейнасці дзяржаўных клубных устаноў як цэнтраў развіцця беларускай нацыянальнай культуры; удасканаленне механізмаў функцыянальна-структурных пераўтварэнняў ў дзейнасці клубных устаноў розных рэгіёнаў краіны ў адпаведнасці з сучаснымі сацыякультурнымі патрэбнасцямі грамадства. Вынікі даследавання рэкамендаваны для выкарыстання работнікамі культуры, знайшлі сваё ўвасабленне ў шэрагу рэспубліканскіх мерапрыемстваў, увайшлі ў вучэбныя праграмы для студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і слухачоў Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Resume

**Makarava Alena Alyaksandrauna**

### Functional and structural changes in the work of clubhouse institutions in Belarus

**Key words:** clubhouse institution, spare time, cultural sphere of spare time, social and cultural activity, folk arts, social and cultural demands of population, functional and structural changes, ethnic and regional traditions, regional cultural policy, new types of cultural institutions.

Thesis is dedicated to studying the process of functional and structural changes in the work of clubhouse institutions in the regions of the country in the making of sovereign and independent Republic of Belarus.

**The purpose of research** is to determine the conditionality, essence, patterns and trends of functional and structural changes in the work of clubhouse institutions.

**The following methods were used in research**: analaysis and synthes of clubhouses' experience, analysis of statistical indicatiors of the development of clubhouse institututions, included and non-included observation, methods of expert evaluation, method of sociologic research, factor analysis of social and cultural demands of population of different regions.

**Scientific novelty and theoretical value of the results obtained include:** determination of periods of formation and development of clubhouse institutions in Belarus; explanation of the reasons of crisis state of clubhouse institutions in Belarus in the mid-80s – 90s; working out of theoretical basis of functional and structural changes in the work of clubhouse institutions around the country taking into account modern trends in the sphere of spare time; determination of link between ethnic and regional traditions and structure of modern cultural demands of a person, social groups of population in the sphere of spare time and the role of state clubhouse institutions in satisfying cultural demands of the population in different regions of the country; discovery of ways of functional and structural changes in the work of clubhouse institutions as regional centers of development of national culture through their specialization, creation of new models of cultural institutions in the sphere of spare time and penetration of regional target social and cultural programs. The theoretical model of a clubhouse institution as a democaratic and popular, humanity-aimed social and cultural institution has been worked out and implemented.

**Social and economic significance of the research** is in its direction towards increasing social and cultural efficiency in the work of state clubhouse institutions as centers of development of national culture; specification of mechanisms of functional and structural changes in the work of clubhouse institutions in conformity with modern social and cultural demands of the society in the sphere of spare time and according to priorities of the state cultural policy. The results of the research are recommended for use to the employed in the cultural sphere. They were also used in a number of republican events and were included in the students' syllabus of the Belarussian State University of Culture and listeners of Belarussian State University of Problems of Culture.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковае выданне

Макарава Алена Аляксандраўна

**ФУНКЦЫЯНАЛЬНА-СТРУКТУРНЫЯ ПЕРАЎТВАРЭННІ Ў ДЗЕЙНАСЦІ КЛУБНЫХ УСТАНОЎ У БЕЛАРУСІ**

Аўтарэферат дысертацыі на суісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук

Падпісана ў друк 10.01.2002г. Фармат 60x84 1/16. Папера пісчая № 2
Ум. друк. арк. 1,28. Ул.-выд. арк. 1,15. Заказ 1. Тыраж 100 экз.

Надрукавана на рызографе Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры.
220001, Мінск, вул. Рабкораўская, 17.